**Л.В. Алейнік**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
e-mail: lada_oleinik@mail.ru

УДК 821.161.3.09

# СПЕЦЫФІКА ІНКУЛЬТУРАЦЫІ Ў ДЗІЦЯЧАЙ ЛІТАРАТУРЫ

*Ключавыя словы: інкультурацыя, дзіцячая літаратура, нацыянальныя традыцыі, выхаванне, народная педагогіка.*

*У артыкуле даследуецца роля літаратурнага твора ў працэсе інкультурацыі асобы. Вызначаюцца ідэйна-мастацкія і жанрава-стылёвыя асаблівасці аповесці беларускай пісьменніцы А. Васілевіч «Расці, Ганька», адрасаванай аўдыторыі юных чытачоў, якія садзейнічаюць асэнсаванню сацыяльных патэрнаў і этычных каштоўнасцяў нацыянальнай культуры.*

Паняцце «інкультурацыя» мае на ўвазе працэс далучэння індывіда да культуры пэўнага грамадства, засваення традыцыйных каштоўнасцей, сімвалаў, нацыянальнага менталітэту і з’яўляецца адным з базавых алгарытмаў у станаўленні асобы. Вядучыя вучоныя ў галіне педагогікі і псіхалогіі адзінадушна сцвярджаюць, што асноўныя светапоглядныя прынцыпы засвойваюцца асобай у дзяцінстве. Мараль, этыка і эстэтыка, прынятыя ў дзяцінстве, вельмі часта робяцца для чалавека вызначальнымі ва ўсім наступным жыцці [2; 4; 6]. Мастацкая літаратура, адрасаваная юным чытачам, здольна, несумненна, выконваць самыя разнастайныя функцыі ў фарміраванні асобы – выхаваўчую, адукацыйную, забаўляльную, інш. Аднак рэпертуар дзіцячага чытання і асобныя літаратурныя творы для дзяцей досыць рэдка разглядаюцца з пункту гледжання праблемы інкультурацыі. Між тым, у эпоху глабалізацыі, калі кардынальна трансфармуюцца этнічныя культуры і ўзнікаюць новыя стылі камунікацый, менавіта мастацкая літаратура захоўвае аўтэнтычную мову, спрадвечныя каштоўнасныя сэнсы і сацыяльныя патэрны, якімі традыцыйна рэгламентаваліся грамадскія ўзаемаадносіны і вызначалася нацыянальная самабытнасць беларусаў.

Сярод узораў беларускай дзіцячай літаратуры адметнае месца належыць тэтралогіі А. Васілевіч «Пачакай, затрымайся…» (1965–1969), у якую ўвайшлі аповесці «Расці, Ганька», «Доля знойдзе цябе», «Новы свет» і «Пачакай, затрымайся». Зусім невыпадкова тэтралогію называюць «галоўнай кнігай» (М. Тычына) пісьменніцы, – гэта насамрэч глыбока асэнсаваная, шчырая і эмацыянальная аўтабіяграфічная гісторыя, якая асвятляе не толькі жыццё маленькай гераіні – вясковай дзяўчынкі Ганькі Гурновіч, але лёс цэлага пакалення беларусаў; гэта па-свойму ўнікальны мастацкі тэкст, «які аднолькава цікава чытаць і дарослым, і дзецям» [7, с. 10], і які сёння, праз

паўстагоддзя пасля выхаду з друку, не страціў актуальнасці, па-ранейшаму з'яўляецца вельмі каштоўным для юных чытачоў.

Перадусім варта заўважыць, што мастацкі тэкст А. Васілевіч вельмі ўдала структураваны – усе аповесці складваюцца з асобных навел, у якіх адлюстраваны найбольш цікавыя і ўражлівыя эпізоды з жыцця маленькай гераіні; у падзеях захавана храналагічная паслядоўнасць, вытрыманы прапорцыі вясёлага і сумнага, няма інфарматыўнай збыткоўнасці.

Асабліва яркай і пранікнёнай стала аповесць «Расці, Ганька», што запачаткавала тэтралогію. Дзяцінства Ганькі Гурновіч прыйшлося на 1920-30-я гады – надзвычай складаны час айчыннай гісторыі. «Не самае лёгкае і не самае шчаслівае дзяцінства – несправядлівасць дзеда Грыся, бацькі Ганьчынай маткі, беднасць, хвароба маці, а потым яе смерць, яшчэ да таго смерць бацькі, які пайшоў ад іх, калі Ганьцы споўнілася два гады. Аднак – гэта пачатак жыцця, светлая яго раніца. Прыроднае светаадчуванне , калі кожная маленькая радасць дае красу быццю» [7, с. 10]. Сапраўды, дзецям уласцівы аптымістычны погляд на свет, яны схільны ва ўсім бачыць станоўчае, добрае. Ганька – тыповае вясковае дзіця – цікаўнае, непаседлівае, трохі памаўзлівае.

Апавядальная манера А. Васілевіч надзвычай выразна выяўляе дынаміку жыцця маленькай гераіні, у якой ужо мноства гаспадарчых абавязкаў, разнастайных хатніх клопатаў, але для гульняў ды забавак гэтаксама часу не бракуе. Ганьку захапляе літаральна ўсё – шчодрыя на ягады і грыбы паляны ў дуброве, густыя зараснікі арэшніку, загадкавы Барэцкі лес, рыбныя мясціны на рэчцы; для дзяўчынкі цэлая прыгода паехаць разам з маці на кірмаш у Слуцак або разам з іншымі дзецьмі сустракаць у вёсцы гандляра Ёселя і вымяньваць у яго разнастайныя прысмакі на яйкі ці анучы. Сваю родную вёсачку дзяўчынка называе «чароўнай краінай Ідыліяй», хаця жыццё ў яе насельнікаў зусім не ідэальнае.

Ганька з маці жывуць вельмі бедна – у асобным пакойчыку ў хаце дзеда. Сваякоў у іх даволі шмат, але ні на якую дапамогу разлічваць не выпадае, бо ўсім аднолькава цяжка, ва ўсіх свае гаспадаркі і свае праблемы. Большую частку дзедавай хаты займае яго нявестка-ўдава з трыма ўнучкамі, а сам стары Грысь «жыве на печы». Пра дзедаў цяжкі характар ведаюць усе вяскоўцы. «Ён і дачцэ роднай, ніяк не даруючы, што яна, шляхцянка, пайшла замуж за мужыка, забараніў пераступаць свой парог. І Алена, жывучы цераз сенцы, не ходзіць на бацькаву палавіну. Зойдзе хіба забраць дачку, бо Ганька, хоць і баіцца дзеда, да цёткі Іваніхі і да сясцёр усё ж забягае» [1, с. 24].

Відавочна, што пісьменніца не прыхарошвае жыццё, выяўляе самыя розныя якасці характараў сваіх герояў, асвятляе і станоўчае, і адмоўнае ў іх узаемаадносінах. Аднак А. Васілевіч выбрала вельмі ўдалую інтанацыю размовы з чытачом – усе стасункі дарослых увасоблены ў творы праз успрыемнасць дзяўчынкі, без залішняга драматызму, па-дзіцячы кранальна

і непасрэдна. Калі Ганька чарговы раз зайшла на «дзедаву палавіну» ды агрызнулася на яго кпіны, стары раз'юшыўся:

«– Ах ты, мужычаня паганае! Вон з мае хаты! <…>

– Пачакай, дачушка, некалі і мы купім сваю ўласную хату… – каб суцешыць дачку, кожны раз абяцае Алена.

– І тады я таксама выганю яго з нашае новае хаты! – радуецца Ганька.

– Няможна гэтак казаць, дачушка, грэх. Дзед стары…» [1, с. 25].

Дробны эпізод, які, аднак, красамоўна даводзіць адзін з традыцыйных прынцыпаў народнай педагогікі – старэйшым трэба саступаць, з бацькамі не варта сварыцца, нават калі яны зусім не маюць рацыі, лепш – прамаўчаць, саступіць, а крыўду дараваць і забыцца.

І яшчэ адзін невялікі фрагмент з твора, які дазваляе маленькай гераіні зразумець, што ўзаемаадносіны паміж яе сваякамі «не надта ідэальныя», што вонкавая дабразычлівасць і ветлівасць могуць быць няшчырымі. Гэты эпізод датычыцца важнай і цяжкой вясковай працы – капання бульбы. «На бульбу едуць зранку, едуць з вазамі, едуць цэлымі сем'ямі. У Ганьчынае маці няма каня, няма воза. І сям'і ў іх усяго толькі іх двое: маці і Ганька. І таму яны на свой загон ідуць удзвюх, ідуць пешкі. Маці нясе лапату з кашом. Ганька нясе торбу з ядою. <…> Дзядзькаў воз абганяе Ганьку з маткай.

– І ты нешта сёння спазнілася, – кідае з воза Алене Фядора.

– Спазнілася…

– І я ж гэтаксама сваіх гультаёў ледзь паўспорвала, – скардзіцца Фядора.

– Нічога, – адказвае Алена, – вас столькі гультаёў, што і не згледзіце, як выкапаеце гуртам.

Ёй прыкра. Ёй балюча. Вось едзе ён, яе родны брат, на возе. Вязе жонку, вязе дзяцей. І ў галаву яму не прыйдзе падкінуць і яе з дачкою. Колькі яны таго б месца занялі, колькі таго цяжару ад іх было б… Ды каня, напэўна, пашкадаваў» [1, с. 75].

Ганька ўсё заўважае, усё разумее. Але пры гэтым адзначае, што маці «ніколі не кажа пры ёй дрэннае слова пра людзей: ні пра суседзяў, ні пра сваякоў», яна наадварот «быццам хоча выгарадзіць, хоча знайсці апраўданне іх чалавечым слабасцям» [1, с. 76]. У паводзінах Алены адлюстраваны не толькі пэўныя выхаваўчыя прынцыпы народнай педагогікі, але нават асобныя рысы нацыянальнага характару, менталітэту, традыцыйнай культуры беларусаў. Асабісты прыклад, як вядома, – самы эфектыўны метад выхавання і навучання. Паводзіны маці, яе меркаванні і ацэнкі, стаўленне да людзей, да жыццёвых праблем – усё гэта Ганька незаўважна і неўсвядомлена пераймае, але трывала засвойвае. Разам з маленькай гераіняй гэты досвед набывае і юны чытач аповесці, які суперажывае дзяўчынцы, няўхільна далучаецца да яе эмоцый і ладу мыслення.

З малых гадоў Ганька, як і іншыя вясковыя дзеці, удзельнічае ў гаспадарчай працы. Калі пасвіць на полі свіней, падмятаць хату або дзерці пер'е шмат навукі не трэба, то каб спрасці кудзелю, выткаць палотны, пашыць сукенку ці спячы хлеб, патрэбны і вопыт, і спрыт. Гэтыя майстэрствы дзяўчынка пераймае ад маці, ад цёткі Іваніхі і стрыечных сясцёр. Натуральна, не ўсё атрымліваецца ў малой адразу, але Ганька стараецца, усё прыкмячае і паўтарае за старэйшымі. «Яна вельмі любіць, каля няма ў хаце мацеры, сесці за кросны і самой ткаць, як дарослай. Лясь набіліцамі, а потым прапусціць чоўнік з цэўкай праз аснову, а поты зноў лясь набіліцамі! Праўда, Ганька не дастае нагамі да панажоў, і таму палатно ў яе атрымліваецца няроўнае і непрыгожае. І маці сварыцца за гэта на Ганьку» [1, с. 31].

Самыя эмацыянальныя старонкі аповесці «Расці, Ганька» прысвечаны традыцыйным беларускім народным святам і шматлікім абрадам, якія іх суправаджаюць. «Ну, і любіць жа Ганька святы! Не абы-якую там драбязу: Ганны, Варвары ці Міхала-страхадзёра… <…> Ганька любіць іншыя святы. Калі хаты беляць. Калі пякуць пірагі і колюць свіней. Калі прыязджаюць госці. Да Каляд, напрыклад, Ганька з мамай і цётка Іваніха з дочкамі рыхтуюцца асабліва старанна» [1, с. 26]. Ганька рупліва дапамагае маці ва ўсіх справах – прыбірае ў хаце, ідзе разам з дарослымі на рэчку, дзе жанчыны палошчуць у ледзяной палонцы бялізну, выбівае пранікам ручнікі. Гэтыя фрагменты твора не толькі змястоўныя і займальныя, але па-свойму важныя – яны дазваляюць юнаму чытачу разам з маленькай гераіняй адчуць узрушаную атмасферу, якая пануе ў вясковым асяроддзі напярэдадні святаў, дапамагаюць усвядоміць інтэрпрэтацыі разнастайных звычаяў і абарадаў, асэнсаваць светапоглядныя каштоўнасці продкаў.

Так, напрыклад, узнёсла і лірычна вядзецца ў аповесці гаворка пра святкаванне Юр'я – аднаго з галоўных святаў земляробчага календара. «Пад вечар, на захадзе сонца, ідзе вёска – ад старога да малога – у поле славіць Юр'я. Нясуць людзі, што ў каго ёсць, выпіць, нясуць святочную закуску. Збіраюцца сем'ямі ці ўсёй раднёй на чыёй-небудзь ніве, сцелюць абрус па руні і сядаюць вакол гэтага абруса, як вакол стала. І такі харошы, такі прыемны сэрцу гэты зялёны незвычайны стол. <…> Людзі п'юць па чарцы, паволі закусваюць, у добрай згодзе гамоняць, гадаючы, якое выдасца лета, якая будзе ўрода на збажыну, якая паша будзе скаціне… <…> І каб не абмінуў Юрай нічые нівы, пакідаюць на кожнай паласе па скібцы пірага з гэтага святочнага стала ці па кавалачку закусі. А каб не стрэла палетак засуха, рунь пырскаюць астаткамі пітва, што наўмысля пакінута ў бутэльках…» [1, с. 34]. Святочнымі абрадамі і рытуаламі ў вялікай ступені вызначаліся і каардынаваліся адносіны людзей, рэгулявалася працоўная дзейнасць. Культура святаў з'яўляецца своеасаблівым адлюстраваннем гістарычнага, этнічнага і духоўнага жыцця народа на розных этапах яго развіцця. Мастацкае ўвасабленне традыцыйных народных святаў з'яўляецца па сваёй сутнасці

эфектыўным механізмам перадачы юным чытачам сацыяльнага вопыту, этнакультурнай інфармацыі.

На долю Ганькі Гурновіч выпалі не надта зразумелыя для яе, але вельмі цяжкія падзеі калектывізацыі. Дзяўчынка выдатна ўсведамляе, як бедна яны з маці жывуць, як цяжка даецца кавалак хлеба. Але «вялікія начальнікі», што прыехалі ў вёску, прымусілі людзей завесці хатнюю жывёлу ў агульны хлеў, паабяцалі, што цяпер у людзей будзе «не жыццё, а рай». Маленькая гераіня слухае, як клянуць гэтых начальнікаў дарослыя, бачыць, як плача маці, шкадуючы сваю кароўку, і ніяк не можа ўцяміць, што ж такое адбываецца. Як падкрэсліваюць даследчыкі творчасці А. Васілевіч, пісьменніца «адна з першых у беларускай літаратуры раскрыла ў сваім творы антыгуманныя і трагічныя падзеі калектывізацыі» [3, с. 286]. Асабліва каштоўна, што гэтыя старонкі айчыннай гісторыі ўвасоблены ў аповесці праз успрыманне дзіцяці – вельмі кранальна, шчыра і непасрэдна, складаныя гістарычныя падзеі адаптаваны ў творы для сучаснай дзіцячай аўдыторыі.

Першая аповесць тэтралогіі завяршаецца трагічна – пасля цяжкой хваробы памірае маці Ганькі, і дзяўчынку забірае да сябе дзядзька. Нельга сказаць, што ў новай сям'і Ганьку крыўдзяць, наадварот – і дзядзька, і цётка, і стрыечныя сёстры ды браты шкадуюць яе і ўсякім чынам падкрэсліваюць свае добрыя адносіны. Але натуральна, асірацеламу дзіцяці ўсё роўна неверагодна адзінока без матулі. «…Адвячоркам <…> Ганька бяжыць на могілкі. <…> – А я ўжо ў школу пайду заўтра, – расказвае Ганька мацеры, прыбіраючы яе магілку кветкамі. – Я ўжо і торбачку склала сваю, і сукенку, і хустку падрыхтавала… <…> А ты не бойся, да цябе я ўсё роўна буду бегаць. Вывучу ўрокі і прыбягу, прынясу кветак…» [1, с. 130]. Менавіта той факт, што назаўтра дзяўчынка ўпершыню выпраўляецца ў школу, што наперадзе ў яе будуць новыя прыгоды і выпрабаванні, робіцца для чытача своеасаблівай інтрыгай і матывацыяй для азнаямлення з наступнымі часткамі тэтралогіі.

Несумненна, аповесць А. Васілевіч «Расці, Ганька» цікавая найперш непасрэднымі перыпетыямі з жыцця маленькай гераіні – займальнымі здарэннямі, вясёлымі і сумнымі падзеямі, але сюжэт твора выконвае насамрэч не толькі забаўляльную функцыю. Сучасныя псіхолагі адзначаюць: «Атрымліваючы ў ходзе ўзаемадзеяння з іншымі людзьмі паўсядзённую інфармацыю шараговага і спецыялізаванага характару, асэнсоўваючы мастацкія вобразы і маральныя калізіі ў творах літаратуры і мастацтва, чалавек прама ці ўскосна фарміруецца як асоба, сацыяльна і культурна адэкватная грамадству» [5, с. 178–179]. Гісторыя сталення Ганькі Гурновіч па-свойму садзейнічае спасціжэнню юнымі чытачамі разнастайных аспектаў беларускай традыцыйнай культуры, далучае да разумення светапоглядных каштоўнасцяў і духоўных набыткаў папярэдніх пакаленняў. Такім чынам адбываецца інкультурацыя чытачоў, фарміраванне іх уяўленняў пра сваю нацыю, пра саміх сябе, пра сваю нацыянальную ідэнтычнасць.

**Літаратура**

1. Васілевіч, А. Расці, Ганька / А. Васілевіч // Выбраныя творы. – Мінск: Беларуская навука, 2010. – С. 21–132.
2. Выготский, Л.С. Раннее детство / Л.С. Выготский // Собр. соч.: в 6 т. – М., 1984. – Т. 4: Детская психология. – С. 340–367.
3. Дасаева, Т.М. Алена Васілевіч / Т.М. Дасаева // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск: Беларус. навука, 2002. – Т. 4. – С. 270–294.
4. Крайг, Г. Психология развития / Г. Крайг / пер. с англ. Н. Мальгиной и др.; под общ. ред. А.А. Алексеева. – СПб.: Питер, 2000. – 992 с.
5. Родионов, В.В. Специфика инкультурации средствами искусства / В. В. Родионов // Социально-гуманитарные знания. – 2015. – № 3. – С. 175 – 186.
6. Рубинштейн, С.Л. Основы общей психологии / С. Л. Рубинштейн. – СПб: Питер, 2022. – 720 с.
7. Сямёнава, А. «Люблю, хвалююся – жыву…» / А. Васілевіч // Выбраныя творы. – Мінск: Беларуская навука, 2010. – С. 5–18.

**L.V. Aleinik**
Belarusian State University
e-mail: lada_oleinik@mail.ru

## Specifics of enculturation in children's literature

*Key words: inculturation, children's literature, national traditions, education, folk pedagogy.*

*The article examines the role of a literary work in the process of inculturation of a person. The ideological-artistic and genre-stylistic features of the story "Rasti, Hanka" by the Belarusian writer A. Vasilevich, addressed to the audience of young readers, which contribute to the understanding of social patterns and ethical values of the national culture, are determined.*

**Е.В. Алексеевич**
Витебский государственный университет имени П.М. Машерова
e-mail: yevgeniyalex@rambler.ru

УДК 821.161.1

# ЛИТЕРАТУРНЫЙ ТИП «МАЛЕНЬКОГО ЧЕЛОВЕКА» КАК СУБЛИМАЦИЯ ПСИХОЛОГИЧЕСКОГО АНАЛИЗА В РУССКОЙ ПРОЗЕ ПОСЛЕДНЕЙ ТРЕТИ XX – НАЧАЛА XXI ВЕКА

*Ключевые слова: маленький человек, женская проза, реализм, постмодернизм, сублимация.*

*В постсоветской эпохе с ослаблением цензуры и сменой ценностных ориентиров в обществе образ «маленького человека» стал выражать сложности адаптации индивида к новой реальности и поиска в ней смысла. Тип «маленького человека» является актуальным и мощным инструментом для психологического анализа, поскольку отражает моральные, этические и психологические дилеммы, сформированные в обществе конкретным*